Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 31 (129) | Серада, 21 лютага 1990 года

## ТЭЛЕГРАМА Ў НУМАР

Дарагія таварышы, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, партызаны і падпольшчыкі, маладыя воіны - інтэрнацыяналісты, служыўшыя тэрміновую службу і будучыя воіны!

Рэктарат, партком, прафком, увесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы сардэчна віншуюць Вас са святам— Днём Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Жадаем Вам поспехаў у працы і вучобе, актыўнай пазіцыі ў барацьбе за мір.

## ПАСЕДЖАННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

31 студзеня 1990 г. адбылося паседжанне акруговай выбарчай камісіі Сацыялістычнай выбарчай акругі № 19 па выбарах народных дэпутатаў Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

На падставе артыкула 34 Закона Беларускай ССР («Аб выбарах народных дэпутатаў мясцовых саветаў народных дэпутатаў Беларускай ССР» камісіяй зарэгістраваныя кандыдатамі ў народныя дэпутаты па Сацыялістычнай выбарчай акрузе № 19 (цэнтр — дзяржуніверсітэт, вуліца Ажэшка, 22).

**Высоцкі Аляксандр Аляксандравіч**, 1963 года нараджэння, адукацыя вышэйшая, беларус, сакратар камітэта камсамола Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, пражывае ў г. Гродна, вылучаны Ленінскім РК ЛКСМ Беларусі.

**Клачко Віктар Васільевіч**, 1932 года нараджэння, адукацыя вышэйшая, беларус, член КПСС, намеснік начальніка вытворчага аб'яднання «Гродняаблаўтатранс», пражывае ў г. Гродна, вылучаны працоўным калектывам ВА «Гродняаблаўтатранс».

**Максімовіч Вячаслаў Аляксандравіч**, 1944 года нараджэння, адукацыя вышэйшая, паляк, член КПСС, загадчык кафедры фізічнага выхавання Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, пражывае ў г. Гродна, вылучаны працоўным калектывам Гродзенскай абласной школы спартыўнай барацьбы.

**Марцінчык Эдуард Адамавіч**, 1955 года нараджэння, адукацыя вышэйшая, паляк, кандыдат у члены КПСС, кіраўнік групы архітэктараў інстытута «Гроднасельбудпраект», пражывае ў г. Гродна, вылучаны працоўнымі калектывамі аддзелаў інстытута «Гроднасельбудпраект».

**Самойла Сяргей Пятровіч**, 1949 года нараджэння, член КПСС, беларус, адукацыя вышэйшая, дырэктар Гродзенскага саюза кааператываў «Ліга», пражывае ў г. Гродна, вылучаны працоўнымі калектывамі кааператываў Гродзенскага саюза кааператываў «Ліга».

# КАНДЫДАТЫ Ў НАРОДНЫЯ ДЭПУТАТЫ ПАПРАСІЛІ СЛОВА



**Бадакоў Аляксандр Васільевіч. 1926 года нараджэння, рускі, член КПСС з 1951 года, адукацыя вышэйшая, прафесар, рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.**

**Вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў праўленнем абласной арганізацыі таварыства «Веды» па Чапаеўскай выбарчай акрузе № 20.**

**Асноўныя палажэнні перадвыбарнай праграмы:**

— дабівацца, каб якаснае навучанне і выхаванне сталі прыярытэтнымі ў дзейнасці абласнога Савета народных дэпутатаў, у выкарыстанні фінансавых рэсурсаў, таму што сучасная якасць жыцця абумоўлена якасцю адукацыі і выхавання;

— садзейнічаць паляпшэнню якасці кіравання, бо жывём мы так, як намі кіруюць;

— змагацца ўсімі сіламі з безгаспадарчасцю, безадказнасцю, бескультур'ем, правапарушэннямі, за сумленнасць, чалавечнасць, сапраўдную дэмакратыю і галоснасць, за асабістую свабоду грамадзян: без маральнага адраджэння народу ў нас няма будучага;

— забяспечыць рэалізацыю планаў і ідэалаў маладых людзей, дапамагчы ім знайсці сваё месца ў грамадстве, знайсці шлях у вялікае жыццё — служыць народу, дабру, сумленнасці і прыгажосці;

— рабіць усё, каб развіццё Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы яшчэ больш эфектыўна адбівалася на росквіце нашага Прынёманскага краю, усё больш садзейнічала росту яго культуры, паляпшэнню сацыяльнага, духоўнага і прыродна-экалагічнага асяроддзя;

— дабівацца, каб неабходная частка прадуктаў харчавання і прадметаў спажывання, якія выпускаюцца насельніцтвам Гродзеншчыны, заставаліся ў нас;

— садзейнічаць стварэнню ўмоў для шырокіх зносін насельніцтва вобласці з працоўнымі іншых краін;

— зрабіць усё магчымае, каб у 13-й і 14-й пяцігодках быў пабудаваны сучасны універсітэцкі комплекс на 5—6 тысяч студэнтаў стацыянара.



**Ліопа Валерый Аляксандравіч. 1939 года нараджэння, член КПСС, адукацыя вышэйшая, кандыдат фізіка-матэматычных навук з 1965 года, дацэнт кафедры квантавай электронікі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Мае навуковыя публікацыі ў вобласці фізікі, педагогікі, экалогіі. Удзельнік шэрагу міжнародных кангрэсаў.**

**Вылучаны ад кааператыва «Элта» у Гродзенскі абласны Савет па 24-й Чыгуначнай выбарчай акрузе.**

1. Неабходна дабівацца поўнай адпаведнасці ўсёй дзейнасці абласнога Савета рэспубліканскаму і саюзнаму заканадаўству, міжнародным нормам, якія павінна выконваць прававая дзяржава. Сярод іх абавязкова павінны выконвацца наступныя палажэнні:

— усе людзі роўныя перад законам і маюць права, без усякай розніцы, на аднолькавую ахову законам. Якія-небудзь льготы і прывілегіі для службовых асоб лічыць парушэннем закону;

— кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю як адна асобна, так і сумесна з другімі, як у горадзе, так і на вёсцы, ніхто не можа быць самавольна пазбаўлены сваёй маёмасці. Усе формы ўласнасці ахоўваюцца дзяржавай;

— кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў, свабоду слова, інфармацыйнага абмену, свабоду рэлігіі, свабоду асацыяцый, мітынгаў і дэманстрацый, свабоду выезда з краіны і вяртання ў сваю краіну, свабоду паездак у іншыя краіны, свабоду ад пасягненняў на яго грамадзянскія правы.

2. У аснове дзейнасці Савета павінна быць воля народа. Савет не можа падпарадкоўвацца жаданням асобных людзей ці асобных грамадскіх і палітычных арганізацый.

3. Фарміраванне мясцовага бюджэту павінна здзяйсняцца за кошт налогаў з усіх прадпрыемстваў, незалежна ад падначаленасці і формы ўласнасці.

4. Выяўленне прыярытэтных кірункаў дзейнасці Савета ў залежнасці ад сацыяльнага, экалагічнага і эканамічнага становішча канкрэтнага пасялення ці раёна. Ацэнкай дзейнасці Савета лічыць не эканамічныя тоны, кубаметры і г. д., а сацыяльныя паказчыкі: забеспячэнне таварамі і прадуктамі харчавання, забеспячэнне жыллём, дзіцячая смяротнасць, захворванні, працягласць жыцця і інш.). Дабіцца павялічэння расходаў на жыллёвае будаўніцтва, асвету, ахову здароўя, культуру і сацыяльную дапамогу бяднейшым слаям насельніцтва.

5. Здзяйсняць незалежны, у тым ліку і грамадскі кантроль за экалагічным становішчам у вобласці. Поўная галоснасць аб становішчы акружаючага асяроддзя. Неабходнасць правядзення спецыяльных даследаванняў выпадкаў перавышэння межа-дапускальных норм забруджвання паветра, вады, прадуктаў харчавання. і тавараў народнага спажывання з указаннем канкрэтных вінаватых асоб.

6. Дабівацца ўмоў для атрымання насельніцтвам поўнай інфармацыі аб дзейнасці ўсіх прамысловых прадпрыемстваў: якую шкоду яны наносяць акружаючаму асяроддзю, як размяркоўваецца іх прадукцыя, якія вынікі магчымых аварый і г. д.

7. Неабходна поўная экалагічная экспертыза прадпрыемстваў, якія зноў будуюцца. Прадпрыемства можа пачаць сваю дзейнасць толькі пасля згоды большасці грамадзян, якія пражываюць у сферы яго экалагічнага ўздзеяння.

8. Уся дзейнасць Савета павінна ўлічваць той факт, што рэспубліка знаходзіцца ў становішчы радыяцыйнай катастрофы ў выніку Чарнобыльскай аварыі, што экалагічнае становішча за апошнія гады ў рэспубліцы не паляпшаецца, а становіцца ўсё больш горшым.

9. Пастаўкі звышпланавай прадукцыі ў агульнарэспубліканскі і агульнасаюзны фонды дапускаюцца толькі ў выпадку задавальнення ўнутрыабласных спажыванняў.

10. Трывожным для рэспублікі фактам з'яўляецца рост злачыннасці сярод моладзі, і таму ад Савета патрабуецца асаблівая ўвага для вырашэння гэтай праблемы.



**Чарапіца Валерый Мікалаевіч, 1945 года нараджэння, рускі, член КПСС з 1973 года, адукацыя вышэйшая, дэкан гістарычнага факультэта, загадчык кафедры гісторыі БССР.**

**Вылучаны кандыдатам у народныя дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў па Пушкінскай выбарчай акрузе № 13 абласным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры.**

Мая жыццёвая пазіцыя, калі гаварыць аб ёй коратка, наступная:

— я — за камуністычныя ідэалы, свабодныя ад скажэння, за паскарэнне працэсу перабудовы, за ўмацаванне аўтарытэта партыі за кошт паляпшэння ўсіх галін жыцця грамадства. Народны клопат — у планы партыі;

— я — за пашырэнне самастойнасці рэспубліканскай партарганізацыі ў складзе КПСС, за сапраўдны суверэнітэт Беларусі ў савецкай федэрацыі, якая развіваецца;

— я — за фактычнае поўнаўладдзе Саветаў, выпрацоўку эфектыўнага механізму рэалізацыі заўваг і прапаноў устаноў і грамадзян па ўсіх пытаннях;

— падтрымліваю ідэю гаспадарчага разліку, які павінен ахапіць не толькі рэспубліку, вобласць у цэлым, але і ўсе ўстановы, выявіць рэальныя магчымасці кожнага чалавека. Паляпшэнне становішча ў эканоміцы і палітыцы звязваю з развіццём навукова-тэхнічнага прагрэсу;

— выступаю за далейшую дэмакратызацыю грамадства, за пашырэнне галоснасці, стварэнне прававой дзяржавы;

— я — за тое, каб кожная сям'я, кожны грамадзянін адчувалі сябе камфортна ў любым нацыянальным асяроддзі, у любым куточку Гродзеншчыны;

— падтрымліваю ўсе ініцыятывы, накіраваныя на развіццё культуры і духоўнасці народа, выхаванне яго на прыярытэтных агульначалавечых, гуманістычных ідэалах і каштоўнасцях. Выступаю за захаванне і адраджэнне помнікаў гісторыі і культуры роднага краю пры шырокай грамадскай падтрымцы;

— лічу, што пашырэнне прамысловай вытворчасці ў вобласці павінна ажыццяўляцца толькі пры гарантыі экалагічнай бязшкоднасці.

**Ад рэдакцыі:**

У наступным нумары газеты таксама будуць надрукаваны перадвыбарныя праграмы кандыдатаў у народныя дэпутаты, асноўныя іх задумкі, мэты, напрамкі барацьбы за перабудову нашага жыцця.

Але вы, паважаныя чытачы, яшчэ маеце магчымасць задаць пытанні кандыдатам у народныя дэпутаты, з якімі газета вас пазнаёміла.

Чакаем званкоў, прапаноў, заўваг, а таксама наступных паведамленняў аб тым, як праходзіла перадвыбарная кампанія, аб саміх выбарах органаў мясцовай народнай улады.

